Новыя кнігі

# У апрацоўцы Якуба Коласа

## Чацвёрты год запар перавыдаюцца народныя казкі ў апрацоўцы класіка

**У Выдавецкім доме «Звязда» толькі што пабачыла свет кніга «Беларускія народныя казкі ў апрацоўцы Якуба Коласа». Тыраж новага выпуску знакамітага творчага праекта класіка беларускай літаратуры — 1500 экземпляраў. Агульны тыраж ранейшых выданняў — у 2020, 2021 і 2023 гадах — роўны 3300 экзэмпляраў.**

Пад адной вокладкай прыгожа аформленага зборніка — шэсць народных казак: «Каза ў арэхах», «Зайкава хатка», «Як пеўнік ратаваў курачку», «Пчала і шэршань», «Дудар», «Не вытрываў». Над апрацоўкай гэтых фальклорных твораў народны пясняр Беларусі працаваў у 1922—1940-я гады. Разнастайныя па тэматыцы, казкі знаёмяць дзяцей са светаўспрыманнем нашых продкаў, вучаць спрадвечным жыццёвым ісцінам, нагадваюць пра тое, што дабрыня, чуласць, развагаласць — сярод галоўных прыярытэтаў жыцця.




Ілюстратарам усіх выданняў зборніка «Беларускія народныя казкі ў апрацоўцы Якуба Коласа» выступае Алег Грубін. Таленавіты кніжны графік знайшоў сваё рашэнне ў разглядзе вобразаў казы (казка «Каза ў арэхах»), лісы, зайчыка і мядзведзя («Зайкава хатка»), пеўня («Як пеўнік ратаваў курачку»), руплівіцы-пчолкі («Пчала і шэршань»), таленавітага музыкі («Дудар»), пана і мужыка-казачніка («Не вытрываў»).

Набыць новае выданне казак можна ва ўсіх кнігарнях ААТ «Белкніга» і ў Мінску ў кнігарні «Белкніга» па адрасе: праспект Незалежнасці, 72. Пажадаем жа юным чытачам і іх бацькам прыемных казачных адкрыццяў!

**Раман СЭРВАЧ.**





# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.03 | 20.16 | 14.13 |
| Віцебск — | 5.50 | 20.09 | 14.19 |
| Магілёў — | 5.53 | 20.06 | 14.13 |
| Гомель — | 5.54 | 19.59 | 14.05 |
| Гродна — | 6.19 | 20.31 | 14.12 |
| Брэст — | 6.23 | 20.28 | 14.05 |

## Месяц

*Першая квадра 15 красавіка.*
*Месяц у сузор'і Льва.*

## Імяніны

*Пр. Адрыяна, Веніяміна, Георгія, Ягора, Івана, Іосіфа, Марыі, Мікіты, Мікалая, Тэадора.*
*К. Роберта, Стафана.*



Фота Ірыны ТАМКОВІЧ.

# ЗАЎТРА




## 17 КРАСАВІКА

Даты | Падзеі | Людзі

**У краіне**

**1903** год — нарадзіўся (м. Любча Навагрудскага павета) Мікалай Набокаў, рускі і амерыканскі кампазітар, педагог, пісьменнік і культурны дзеяч. Унук сенатара Дзмітрыя Набокава. Стрыечны брат пісьменніка Уладзіміра Набокава.

**1932** год — рашэннем Савета Народных Камісараў БССР заснаваны Цэнтральны батанічны сад у Мінску.

**1947** год — нарадзіўся (п. Коханава Талачынскага раёна) Валерый Славук, беларускі кніжны графік-ілюстратар. Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Беларусі. Прафесар кафедры графікі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.



**У свеце**

**1492** год — Хрыстафор Калумб падпісаў пагадненне з каралём і каралевай Іспаніі пра здзяйсненне экспедыцыі для пошуку заходняга шляху да Індыі.

**1521** год — Марцін Лютэр выступіў з прамоваю перад Вормскім рэйхстагам з падтрымкаю ўласнага вучэння, з-за чаго яго прызналі ерэтыкам. Пасля́доўнікі вучэння Лютэра атрымалі назву «лютэране», а само вучэнне было названа «лютэранствам». Яго пераклад Бібліі на нямецкую мову, у адрозненне ад класічнай латыні, зрабіў Святое Пісанне больш даступным шырокім слаям, што аказала велізарны ўплыў на царкву і на нямецкую культуру. Гэта спрыяла развіццю стандартнай версіі нямецкай мовы, дадало некалькі прынцыпаў у мастацтва перакладу.



**1941** год — Югаславія капітуліравала перад Германіяй. Цяпер ужо нішто не перашкаджала рэйху рыхтавацца да вайны з Савецкім Саюзам.

**Так гаварыў...**

**УЛАДЗІМІР КАРАТКЕВІЧ:**

*«На зямлі існуе адзіная непапраўнасць, адзіная незваротнасць. Гэта смерць. Пакуль яна не прыйшла — усё можа змяніцца тваёй воляй або капрызам лёсу».*

## УСМІХНЕМСЯ

**— Колькі б мне гадоў ні было, я буду ведаць заўсёды, што адзін сантыметр — гэта дзве сшыткавыя клеткі!**

**— Цяпер і хлеб менш за кілаграм, і малако менш за літр... Думаеш, клетачкі тыя ж засталіся?!**

Прыходзіць муж з работы дадому стомлены.

Кажа жонцы: «Хто б ні тэлефанаваў, мяне дома няма».

Раздаецца званок... Жонка бярэ трубку і кажа: «Муж дома!»

Муж зрываецца з крэсла і крычыць: «Ты што, дурніца? Я ж табе сказаў: мяне няма!!!»

Жонка: «Гэта мне тэлефанавалі».



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 11.766. Індэкс 63850. Зак. № 896.

Нумар падпісаны ў 19.30 16 красавіка 2024 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12